ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (841) ● Чацвер, 16 сакавіка 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

## Камсамольскай арганізацыі БДУ — 50 год!

# ВЕХІ ГІСТОРЫІ — ПУЛЬС ЖЫЦЦЯ

У ГЭТЫЯ ДНІ спаўняецца 50 год камсамольскай арганізацыі нашага ардэнаноснага універсітэта. Кожны юбілей — гэта падсумаванне вынікаў працы, вывучэнне новых перспектыў для ўпэўненых крокаў у будучае. Камсамольцы сённяшняга дня, гаспадары самай сучаснай навучальнай установы, не хадзілі лавінай у страі конармейскіх атак, не змагаліся са зброяй у руках з класавым ворагам, не стаялі сцяной супраць фашысцкіх захопнікаў. Але упартая праца і вучоба першых студэнтаў універсітэта гераічных 20-х гадоў сталі нормай паводзін для студэнтаў сённяшняга дня. Настойлівасць у барацьбе за выкананне першых пяцігодак, непахіснасць камсамольцаў у змаганні супраць любога ворага, гарачы і шчыры ўдзел у будаўніцтве новага жыцця — гэта самая лепшая школа гарту для тых, хто сёння штурмуе вяршыні навукі. І разам з гэтым камсамольцаў БДУ усіх пакаленняў яднае непахісная рэвалюцыйнасць, класавая свядомасць, высокая ідэйная загартоўка ў барацьбе за выкананне задач партыі і народа.

Амаль дзесяцітысячная камсамольская арганізацыя БДУ звярае свой крок з запатрабаваннямі часу, грунтуе сваю дзейнасць на рашэннях XXIV з'езда партыі, матэрыялах Усесаюзнага злёту студэнтаў, яна імкнецца найбольш поўна выканаць сваю асноўную задачу — выхоўваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, актыўных прапагандыстаў і агітатараў, баявых партыйных арганізатараў.

Сённяшні дзень для камсамольцаў універсітэта — гэта асабліва шырокі ўдзел у грамадскім жыцці, паспяховая вучоба пад дэвізам «Тры — не адзнака», навукова-даследчая дзейнасць з практычным вынікам, дзяржаўнай карысцю, мастацкая самадзейнасць на ўзроўні прафесійных калектываў і г. д.

Камсамольская арганізацыя універсітэта заўсёды ў творчым пошуку. Шырокія сувязі з калектывамі заводаў, фабрык, калгасаў, саўгасаў, воінскімі падраздзяленнямі, школамі гарадскіх і сельскіх раёнаў спрыяюць самым актыўным чынам накапленню вопыту працы з людзьмі, узбагачаюць студэнтаў-камсамольцаў жыццёвай практыкай. Па ўсёй рэспубліцы і далёка за яе межамі добра ведаюць таленавітых спевакоў і танцораў, пранікнёных і шчырых паэтаў, эрудзіраваных лектараў, якія паспяхова выступаюць перад насельніцтвам.

Імкненне камсамольцаў універсітэта да практычнага ўдзелу ў жыцці пашыраецца з кожным годам. Нашы будаўнічыя атрады вядомы за межамі рэспублікі, а таксама ў братніх сацыялістычных краінах. Школы, клубы, жылыя дамы будуюць студэнты ў час працоўнага семестра. Пройдзены сотні таёжных кіламетраў, дзе паўсталі вышкі высакавольтных ліній электраперадач, бясконцай лентай працягнулася палатно пракладзенай імі чыгункі.

Працоўны семестр акумулюе энергію студэнтаў, дазваляе шырэй зразумець фронт камуністычнага будаўніцтва, а галоўнае — выхоўвае волю, загартоўвае пачуцці будучага спецыяліста і грамадзяніна.

Камсамольцы універсітэта пад кіраўніцтвам сваіх старэйшых таварышаў, выкладчыкаў змагаюцца за «свой радок у навуцы», выступаюць з цікавымі дакладамі, удзельнічаюць у распрацоўцы новых прыбораў, публікуюць навуковыя артыкулы. На прыродазнаўчых факультэтах ужо шмат год студэнты удзельнічаюць у выкананні дагаворных прац для прадпрыемстваў. Цяпер час дыктуе неабходнасць такой працы на гуманітарных факультэтах. Ёсць першыя спробы, ёсць першыя удачы і вынікі. Студэнты-філосафы, напрыклад, падрыхтавалі да выдання кнігу аб развіцці філасофскай думкі ва універсітэце.

Камітэт камсамола сумесна з кафедрамі грамадскіх навук імкнецца пашырыць гэты вопыт.

Сінтэз вучобы і працы, грамадскага ўдзелу ў жыцці спрыяльна уплывае на працэс фарміравання асобы камсамольца-студэнта 70-х гадоў. Камсамольская арганізацыя імкнецца як мага шырэй выкарыстаць тыя формы выхаваўчай работы, якія даюць найбольшы эфект, спалучаюць у сабе не толькі творчы пошук, патрабуюць ініцыятывы, але і прыносяць эмацыянальнае задавальненне, развіваюць прагу да новых здзяйсненняў і пошукаў.

Разам з тым патрэбна больш пільна прыглядзецца да працы камсамольскіх груп. Гэта наша асноўная сіла, там канцэнтруецца ўся праца, нараджаецца поспех у вучобе. Нельга выпускаць з поля зроку першы курс. Задавальняцца тым, што ў прайшоўшую сесію паспяховасць на першым курсе на 3,5 працэнта вышэй, чым у мінулым годзе, яшчэ рана. Якраз першыя курсы — гэта той участак, дзе больш за ўсё нявыкарыстаных рэзерваў для росту агульнай паспяховасці.

Настаў момант на аснове грамадска-палітычнай практыкі прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў жыцці ўсіх членаў нашага калектыву. Размах працы ў камсамольскай арганізацыі універсітэта вялікі. Кожны студэнт змог бы выбраць сабе справу па душы. Ужо з самага першага курса патрэбна давяраць студэнту хай невялікую, але канкрэтную справу, імкнуцца да больш шырокага ахопу студэнтаў грамадскай працай — не замыкацца ў вузкім коле актыву. Пры любой працавітасці і ініцыятыўнасці актыў не зробіць таго, што зробіць камсамольская арганізацыя.

Праблем у нас шмат. Іх патрэбна вырашаць канкрэтна і своечасова, бо кожны дзень ставіць новыя і новыя складаныя задачы.

Каб быць дастойнымі пераемнікамі слаўнай 50-гадовай гісторыі камсамольскай арганізацыі БДУ, нам патрэбна сёння працаваць з патроенай энергіяй і стараннем.

Камітэт камсамола універсітэта звяртаецца да усіх камсамольцаў з самымі шчырымі і сардэчнымі словамі віншавання, жадае нязгаснага камсамольскага задору і творчага пошуку на ўсё жыццё. Наша павага і шанаванне старэйшым таварышам, выкладчыкам — усім тым, хто аддаў і аддае гарэнне сваіх сэрцаў справе выхавання моладзі.

А. СЛУКА,
сакратар камітэта камсамола БДУ.



*НА ЗДЫМКУ: заняткі па метадах вылічэння ў студэнтаў III курса факультэта прыкладной матэматыкі вядзе ст. выкладчык І. І. КОРЗУН.*

Фота Д. Чаховіча.

## ВЯСНА ПЯЦІКУРСНІКАЎ

Вясна заўсёды прыносіць з сабой сонца, усмешкі, добры настрой. Нашым старэйшым сябрам-пяцікурснікам яна нясе яшчэ і хваляванні. Закончыліся пяць год вучобы, наперадзе—дарога ў вялікае самастойнае жыццё. Будуць яшчэ абарона дыплома, дзяржаўныя экзамены, выпускны вечар, а цяпер—размеркаванне. Не так даўно, перад практыкай, прайшло размеркаванне фізікаў. А цяпер каля 206-й аўдыторыі ў галоўным корпусе не прайсці. Выбіраюць месца будучай працы філолагі, географы.

Ва ўсе куткі Беларусі раз'едуцца выпускнікі універсітэта.

У гэтым юбілейным навучальным годзе разам з дыпломам маладыя спецыялісты атрымаюць памятку-наказ, у якой залатымі літарамі будзе напісана: «Дзе б ні працаваў ты, якую б пасаду ні займаў—памятай: ты скончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна у год яго паўвекавога юбілею.

Мы спадзяёмся, што праз усё жыццё ты з гонарам пранясеш сцяг выпускніка БДУ імя У. І. Леніна, будзеш заўсёды на пярэднім краі барацьбітоў за ідэі Леніна, ідэі камунізму, усе сілы будзеш аддаваць справе выхавання маладога пакалення ў духу вернасці ідэям партыі, пралетарскага інтэрнацыяналізму, што сваёй самаадданай працай на карысць нашай Айчыны будзеш яшчэ больш умацоўваць аўтарытэт ардэнаноснага універсітэта.

Жадаем табе маладога задору, бадзёрасці і плённых поспехаў».

Л. ДРУЗЕВА.

## ВЕСТКІ З ФІЗФАКА

● Нядаўна адбыўся камсамольскі сход супрацоўнікаў фізфака. На ім разглядалася пытанне аб выкананні абавязацельстваў па Ленінскаму заліку.

● Агульную ўвагу прыцягвае насценгазета «На ахове сацыялістычнай уласнасці» — орган прафгрупы аховы БДУ. Першы нумар выйшаў 7 сакавіка. Ён добра і з густам аформлен.

● Працягваецца фарміраванне студэнцкіх будаўнічых атрадаў. На субяседаванні быў абмеркаван састаў атрада «Аэліта», які будзе працаваць у Казахстане.

● З лікам 5:13 закончыўся хакейны матч на першынство універсітэта паміж камандамі фізфака і ФПМ.

# ДАКЛАДНАЕ ПААНАВАННЕ—ВАЖНЕЙШАЕ ЗВЯНО НАВУЧАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ

Высокія патрабаванні, прад'яўляемыя да навучання развіццём навукі і тэхнікі на даным этапе, не могуць быць паспяхова задаволены без строгага планавання часу, які затрачваецца на вучэбную і навуковую работу. Для пастаяннага удасканалення сваіх ведаў, выпрацоўкі навыкаў даследчыка, шырокага тэарэтычнага кругагляду працэс навучання усё больш абапіраецца на самастойную, блізкую да даследчай, дзейнасць студэнта.

Такія элементы, як, напрыклад, разлікі на лагарыфмічнай лінейцы, засваенне метадаў прыбліжаных вылічэнняў, асновы бібліяграфіі, патрабуючыя ведання адной-дзвюх замежных моў, вучэбныя даследаванні, уключаныя ў расклад заняткаў на старэйшых курсах, укараненне аўтаматызацыі ў вучэбна-метадычную работу, прымяненне вылічальных машын і механічных сродкаў у навучальным працэсе патрабуюць даволі дэталёвай адпрацоўкі тыднёвай загрузкі ў межах вучэбнага раскладу. Павінен быць улічан і час, які адводзіцца на заняткі спортам, адпачынак, харчаванне, дарогу ва універсітэт. Ліквідаванне такіх недахопаў, як сумяшчэнне некалькіх лабараторных або практычных заняткаў у рамках аднаго вучэбнага дня, надзвычай вялікая колькасць фактычных старонак рэкамендуемай літаратуры для самастойнага вывучэння, нераўнамернае планаванне семінарскіх заняткаў і іншых, аблегчыць устанаўленне рытмічнасці ў рабоце студэнтаў, выключыць перагрузкі, г. зн. будзе садзейнічаць у далейшым неабходнаму тэхнічнаму забеспячэнню вучэбнага працэсу.

Група народнага кантролю Белдзяржуніверсітэта сумесна з прафкомам намячае правесці праверку тыднёвай загрузкі студэнтаў і далейшы аналіз вынікаў праверкі і просіць прапановы і заўвагі зацікаўленых аддзелаў, грамадскіх арганізацый, а таксама выкладчыкаў і студэнтаў па гэтаму пытанню падаваць у рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт».

А. АНДРЭЕЎ,
дацэнт, кіраўнік вучэбнага сектара групы народнага кантролю БДУ.

# ВУЧОБА ДЛЯ СЯБЕ?..

Камсамольскае жыццё

На павестцы дня пасяджэння камітэта камсамола біялагічнага факультэта стаяла адно пытанне—няяука студэнтау на агульнафакультэцкі камсамольскі сход. Не часта бывае такая павестка. Самі згадзіцеся: з 704 камсамольцау факультэта на сход прыйшло менш 150 чалавек. Прычым пытанне стаяла на ім больш чым сур'ёзнае — падвядзенне вынікау зімовай экзаменацыйнай сесіі. Справа ускладнялася і тым, што вынікі прайшоушай сесіі далека не задавальняюць ні студэнтау, ні выкладчыкау. Камітэт камсамола адразу ж сабрау свой актыу. На пасяджэнне, акрамя членау камітэта камсамола і выкладчыкау, былі запрошаны і самі вінoунікі непажаданых «урачыстасцей». Завязалася прынцыповая размова.

Студэнтка Рован атрымала у сесію толькі добрыя і выдатныя адзнакі. На сход не з'явілася.

— Прычыны? Самыя нязначныя.

Аднагалоснае рашэнне камітэта: строгае папярэджанне.

Студэнтка - выдатніца III курса Юлусава таксама не з'явілася на сход.

— Прычыны? Няма.

— Ваша група займае апошняе месца на курсе па паспяховасці. Сем студэнтау маюць запазычанасці. Што вы зрабілі як студэнтка - выдатніца, каб палепшылася паспяховасць вашых сакурснікау?

Маучанне... Праз хвіліну: «Я занята навуковай працай».

Так, вядомае, прыкрае, гаворачае маучанне: «Я прыйшла вучыцца для сябе».

Сакратар зачытвае яшчэ прозвішчы. Вымовы, папярэджанні, вымовы з паведамленнем бацькам і у школу, якая дала дарогу сюды, ва універсітэт.

Ці правільна гэта? Так. Правільна. Безумоуна.

Слова бярэ дэкан факультэта Юрый Канстанцінавіч Фамічоу. Ён горача выступае супраць гэтага гаворачага маучання: сам былы камсамолец, ён не можа зразумець, што значыць не выконваць камсамольскі статут, ставіць асабістыя інтарэсы вышэй камсамольскага доугу.

Я сядзеу на галёрцы і, працяты гэтай пранікнёнай, шчырай гаворкай, быу поунасцю салідарны з выступаушым. Чалавек жыу сваёй маладосцю, камсамолам. Ці зразумеюць яго астатнія, ці зразумеюць тыя, для каго спатканне з роднай бабуляй уяулялася важнейшым, чым з'яуленне на камсамольскі сход? Павінны зразумець. Інакш нельга.

**Г. ЧЫГІР.**
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).





**НА ЗДЫМКАХ: ідуць заняткі па нямецкай мове у студэнтау I курса гістарычнага факультэта. Вядзе іх Вольга Барысауна КОВАЛЬ.**

Фота **Д. Чаховіча.**

# ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ ПАСТАНАЎЛЯЕ

**Усім байцам СБА універсітэта неабходна прайсці медыцынскі агляд у медпункце БДУ у наступныя дні з 10.00 да 17.00.**

**I ЭТАП—з 20 сакавіка па 5 красавіка (па 170—200 чалавек штодзённа).**

**20 сакавіка—гістфак;**

**21 сакавіка—юрфак;**

**22 сакавіка—філфак, хімфак;**

**23 сакавіка—гістфак, юрфак, філфак, хімфак.**

**Закончыць медагляд да 25 сакавіка.**

**27, 28 сакавіка--матфак;**

**29, 30 сакавіка—ФПМ;**

**31 сакавіка, 3, 4 красавіка — фізфак.**

**Першы этап медыцынскага агляду закончыць 4, 5 красавіка.**

**II ЭТАП—з 20 красавіка па 8 мая.**

**20 красавіка—гістфак;**

**21 красавіка—юрфак;**

**24, 25 красавіка—філфак, хімфак.**

**Гісторыкам, юрыстам, філолагам, хімікам закончыць медыцынскі агляд да 27 красавіка.**

**28 красавіка—матфак;**

**3, 4 мая—ФПМ;**

**5, 8, 10 мая—фізфак.**

**Закончыць другі этап агляду да 10 мая.**

**III ЭТАП**

**22, 23 мая—гістфак;**
**24, 25 мая—юрфак;**
**26—29 мая—філфак, хімфак;**
**30, 31 мая—матфак;**
**1, 2 чэрвеня—ФПМ;**
**5—7 чэрвеня—фізфак.**

**Поунасцю закончыць медагляд да 8 чэрвеня. Кантроль за выкананнем графіка ускласці на сакратароу камітэтау камсамола і начальнікау штабау працоуных спрау факультэтау.**

# ПРАФЕСІЙНАЯ РАЗМОВА

„ПРАФЕСІЯ ЦЯЖКАЯ, АЛЕ ЦІКАВАЯ». — так была сфармулявана тэма дыспуту, праведзенага ўпершыню сярод супрацоўнікаў універсітэцкай бібліятэкі. Усе 60 супрацоўнікаў сабраліся разам, каб адкрыць таямніцы сваёй душы, выказаць хвалюючыя іх думкі. Шмат аб чым хацелася пагаварыць бібліятэкарам, абмеркаваць шэраг пытанняў, і галоўныя з іх—як лепш абслугоўваць чытачоў, выкарыстоўваць рознабаковыя формы і метады прапаганды кнігі, шляхі найхутчэйшага давядзення да чытача новай літаратуры.

За апошні час нязмерна павысіліся патрабаванні да вузаўскіх бібліятэк. Сёння іх задача заключаецца ў тым, каб усімі сіламі садзейнічаць падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў, аказваць усямерную дапамогу вну ў яе навуковай, вучэбнай і выхаваўчай працы.

Асабліва павялічылася роля бібліятэкара цяпер, калі ўведзена новая форма абслугоўвання чытачоў — адкрыты доступ да кніжных фондаў.

І вось іменна тут, на дыспуце, супрацоўнікі бібліятэкі выказалі думкі аб неабходнасці павелічэння фонду метадычнай літаратуры, новых матэрыялаў аб дасягненнях айчыннага і замежнага бібліятэказнаўства, арганізацыі выставак навінак бібліятэчна-бібліяграфічнай літаратуры, аб рэгулярным правядзенні сярод бібліятэкараў аглядаў новых паступленняў.

— Цяпер, калі сувязь з чытачом становіцца ўсё больш цеснай,—як слушна адзначыла адна са старэйшых супрацоўнікаў абанемента Н. М. Славінская, — мы павінны не толькі хутка пераключацца з аднаго аб'екта на другі, не толькі добра ведаць бібліятэчны фонд, але і вывучаць новыя метады работы з чытачом, каб ён не пайшоў ад нас незадаволены і каб яго ўдзячныя словы ўзнімалі наш настрой, напаўнялі ўсведамленнем неабходнасці сваёй працы, прыносілі пачуцці задаволенасці ад таго, што ты прапанаваў чытачу іменна тую, неабходную яму ў даную хвіліну кнігу.

Але ж як зрабіць, каб гэтая, так неабходная чытачу новая кніга хутчэй трапіла да яго? І вось тут не абысціся без добра наладжанай работы ўсіх аддзелаў бібліятэкі: і камплектавання, і апрацоўкі, і, безумоўна, дасведчанасці аддзелаў аб наступленнях новай літаратуры.

— Менавіта ад пэўнай каардынацыі дзейнняў усіх аддзелаў, — як правільна адзначыла загадчык аддзела камплектавання Л. І. Зрубовіч,—залежыць гонар бібліятэкара, гонар усёй нашай універсітэцкай бібліятэкі.

Цяпер кніжны фонд бібліятэкі БДУ налічвае 1 млн. 96 тысяч тамоў. Ёй прысвоена II група, што дало магчымасць не толькі павялічыць кніжны фонд, але і штат працаўнікоў: павялічылася колькасць бібліёграфаў, бібліятэкараў, выдзелен супрацоўнік спецыяльна для дастаўкі з кнігасховішча літаратуры па заяўках чытачоў. Таму большая частка заказаў выконваецца за 1,5—2 гадзіны.

У хуткім часе плануецца зрабіць новую перабудову. Так, студэнцкая чытальная зала падзеліцца на дзве: прыродазнаўчых і гуманітарных навук. Кніжныя стэлажы займуць месца ўздоўж сцен, а чытачы змогуць свабодна браць неабходную літаратуру і працаваць з ёю тут жа за сталамі. Расстаноўку літаратуры прыйдзецца таксама рабіць чытачам.

Акрамя таго, існуючы цяпер абанемент будзе падзелен на вучэбны (для студэнтаў) і навуковы (для аспірантаў, старшакурснікаў і супрацоўнікаў універсітэта).

Усё гэта, безумоўна, дасць магчымасць палепшыць абслугоўванне чытачоў. Разам з тым усё большае значэнне набывае знаёмства студэнтаў з асновамі бібліяграфіі, засваенне сістэмы класіфікацыі кніг, уменне карыстацца каталогамі. Дапамагаюць студэнтам набыць гэтыя веды супрацоўнікі нашай бібліятэкі З. І. Рахманчык, Л. П. Міцкевіч і іншыя, якія рэгулярна праводзяць бібліятэчна-бібліяграфічныя заняткі ў студэнцкіх групах.

Бібліяграфічная дасведчанасць чытачоў дазволіць бібліятэкару аддаць больш часу масавай, кансультацыйнай і выхаваўчай працы, арганізацыі выставак, правядзенню аглядаў літаратуры. І цяпер у бібліятэцы шырока выкарыстоўваюцца разнастайныя формы масавай работы. За апошнія гады было арганізавана мноства тэматычных і юбілейных выставак, гутарак, дыспутаў, абмеркаванняў кніг.

Вялікай папулярнасцю ў чытачоў карыстаюцца рэгулярныя выстаўкі навінак літаратуры, толькі што выйшаўшых з друку часопісаў (на замежных мовах). Уся гэтая шматгранная дзейнасць калектыву накіравана да адной мэты—шырэй раскрываць фонд бібліятэкі, лепш пазнаваць запатрабаванні чытача, дапамагаць яму ў рабоце з кнігай, выхоўваць людзей новага, камуністычнага грамадства.

Але ж дасягненне гэтай мэты, як паказаў час і вопыт работы бібліятэк БДУ, ЛДУ, Саратаўскага універсітэта і іншых, немагчыма без перабудовы ўсёй работы бібліятэкі, без пастаяннага пашырэння кругагляду бібліятэкара. І таму яшчэ больш увагі ўдзяляецца наладжванню строгай дысцыпліны, лепшай арганізацыі працы, павышэнню грамадска-палітычнага ўзроўню супрацоўнікаў. Ужо цяпер рэгулярна праводзяцца ў аддзелах палітінфармацыі і палітзаняткі, лекцыі кваліфікаваных спецыялістаў па розных галінах навукі, некаторыя бібліятэкары здалі экзамены кандыдацкага мінімуму.

І хоць у нашай рабоце сустракаецца шмат цяжкасцей, мы, бібліятэкары, любім сваю работу і пастараемся зрабіць усё для таго, каб яна прыносіла яшчэ больш карысці нашым чытачам. Аб гэтым сведчыць і дыспут, які адбыўся ў бібліятэцы.

**А. БІБІКАВА,**
**бібліятэкар.**



*Практычныя заняткі па оптыцы у студэнтау II курса хімічнага факультэта.*

*Фота Д. Чаховіча.*

# ШТО ПАКАЗАЛА АНКЕТА

*Рэдкалегію насценгазеты ФПМ «Алгарытм» зацікавіла пытанне: як наладжана харчаванне студэнтау нашага універсітэта? Для яго вырашэння мы правялі сярод студэнтау факультэта анкету, якая паказала, што студэнты ацэньваюць арганізацыю харчавання як пасрэдную. Якія ж недахопы можна адзначыць на аснове іх адказау?*

*На жаль, прыходзіцца траціць многа часу на абед у сталовай (да 50 мінут), які абыходзіцца каля 75 капеек. Значыць, за месяц толькі на абеды ідзе 22,5 руб. Нам здаецца, гэта некалькі дарагавата для тых, хто атрымлівае стыпендыю 35 руб.*

*Вельмі многія адзначылі дрэнную якасць прыгатавання страу ва універсітэцкай сталовай. За 60 капеек у іншых сталовых можна паесці значна лепш. Ці не гаворыць гэта аб тым, што справы ў нашай сталовай могуць ісці лепш? Даводзіцца адзначаць і антысанітарныя умовы у нашай сталовай. Канешне, усякі, каму пашчасліла паесці у гадзіну пік, з задавальненнем прыбярэ за сабой пасуду, але ж нехта павінен выціраць і са стала. А крошкі, разліты борщ, брудныя салфеткі—не рэдкасць на сталах.*

*Адказваючы на пытанні, студэнты намецілі і сякія-такія шляхі паляпшэння. Перш за усё, на наш погляд, неабходна арганізаваць продаж абанементных талонау на абед на увесь месяц. Тады ніхто не застанецца галодным перад стыпендыяй. Але часам студэнт бывае настолькі занят, што яму няма калі спусціцца уніз і паесці. А чаму б не арганізаваць продаж піражкоу на паверхах? Нарэшце, прафсаюзным органам не шкодзіла б уважліва кантраляваць якасць прыгатавання страу у сталовай, прыцягваючы да гэтага студэнтау.*

*Нам здаецца, што нічога нерэальнага ў нашых прапановах няма. Спадзяемся, што гэтая заметка не застанецца па-за увагай і зацікауленыя асобы адкажуць нам.*

*Рэдкалегія насценгазеты «АЛГАРЫТМ», калектыуны карэспандэнт «Беларускага універсітэта».*

СЁННЯ я гартаю старонкі блакнота, і міжволі успамінаюцца інтэрлагер на Мінскім моры у пансіянаце «Юнацтва», семінар актыву замежных студэнтау, Міжнародны дзень студэнтау, Тыдзень Афрыкі, II Усесаюзны аутапоезд «Дружба»...

170 савецкіх і замежных студэнтаў, прадстаунікі 22 краін свету з'яуляліся мінулым летам удзельнікамі II Усесаюзнага аутапоезда, маршрут якога пралёг па дарогах Беларусі.

Я заусёды з хваляваннем успамінаю словы заслужанага артыста СССР Махмуда Эсамбаева, які выступау тады перад удзельнікамі аутапоезда: «Паверце, дарагія сябры, я не лічу, што сярод вас ёсць замежныя госці. Ёсць, па-моїму, толькі сябры, якія, праўда, нарадзіліся далёка ад нашай краіны. Дай богу у вушы ды гэтыя словы, і няхай на зямлі будзе мір і толькі мір!»

* * *

Калі я выпадкова сустракаюся з в'етнамскім студэнтам Нгуен Хыу Монгам, заусёды вітаю яго усмешкай. І кожнаму з нас успамінаецца сваё: яму — трэці працоуны семестр, ударная камсамольская будоуля у Кастрычніцкім раёне, што на Гомельшчыне, мне — мінулае лета, фестываль студэнцкіх будаунічых атрадау у маім родным Кастрычніку.

Яшчэ не адцвілі у думках ружовыя кветкі успамінау аб аутапоездзе і яшчэ не знят в'етнамскі значок, падораны у час падарожжа, з якім я і прыйшла на стадыён у час спаборніцтвау паміж зборнымі двух студэнцкіх атрадау. Непадалёку стаялі в'етнамскія студэнты у адзенні байцоу будаунічых атрадау. Адзін з іх нечакана крануу за рукау суседа: «Глядзі, значок! Наш, в'етнамскі!»

# У СЯБРОЎСКАЙ СЯМ'І

Праз хвіліну мы ужо паціскалі адзін аднаму рукі, і я перадавала ім прывітанні ад удзельнікау аутапоезда—іх аднакурснікау.

* * *

Хутка новы навучальны семестр паклікау студэнтау у аудыторыі. Насценная газета «Дружба» была аж перасычана уражаннямі і успамінамі замежных студэнтау.

Па прапанове ліванскага студэнта Жака Антуана Амідзі пачау выходзіць дадатак пад назвай «Пазнаёмцеся з Ліванам», «Пазнаёмцеся з Балгарыяй», у якім змяшчаліся паштоукі з краявідамі.

У час выпуску газеты не абыходзілася без смешных здарэнняу. Успамінаецца дыялог рэдактара са студэнтам-в'етнамцам.

РЭДАКТАР: — У наступным нумары павінен быць матэрыял са здымкамі.

СТУДЭНТ - В'ЕТНАМЕЦ: — Ты маеш на увазе картошкі?

РЭДАКТАР: — Якую картошку! Фатаграфіі, разумееш?

* * *

Ва універсітэце толькі на асноуных факультэтах займаецца каля 260 замежных студэнтау з 17 краін свету. Аднаму савету дружбы цяжка высвятляць і вырашаць усе патрэбы зямляцтвау, улічваць іх прапановы. І на дапамогу тут прыходзяць камітэт камсамола, прафком універсітэта, гарадскі камітэт камсамола.

Нядауна прадстаунікі розных зямляцтвау сабраліся на чарговую сустрэчу. Сярод іх шмат маіх знаёмых. Праз стол шчыра усміхаецца Чан В'ет Хунг. Некалькі дзён таму назад ён разам з в'етнамскімі камсамольцамі-актывістамі прымау удзел у падпісанні новага дагавору аб супрацоуніцтве з камсамольскай арганізацыяй універсітэта. Побач з в'етнамцам вельмі сур'ёзны і стрымапы балгар Панайот Дзенеу, крыху далей сціпвокі немец Круша Іаханес, ліванец Жак Амідзі. На сустрэчы прысутнічаюць таксама студэнты з Алжыра, Кубы, Танзаніі і іншых краін свету. Яны віншуюць камсамольскую арганізацыю універсітэта з надыходзячым святам — 50-годдзем.

— Мы вітаем надыходзячы юбілей камсамола універсітэта і з вялікім задавальненнем будзем прымаць удзел у яго святкаванні. У час вучобы у Савецкім Саюзе мы будзем вывучаць багаты вопыт вашай арганізацыі, — гаворыць Круша Іаханес.

Да прапаноу замежных студэнтау па пытаннях вучобы, адпачынку, жыллёвых умоу уважліва прыслухоуваюцца сакратар камсамольскай арганізацыі універсітэта А. Слука, старшыня прафкома універсітэта М. Дрозд, прадстаунік з гарадскога камітэта камсамола А. Юзафовіч. Шчырая размова на сустрэчы будзе спрыяць далейшым сяброускім адносінам паміж савецкімі і замежнымі студэнтамі.

**В. РАДКЕВІЧ.**



⊙

**Значнае месца у вучэбнай праграме студэнтау геграфічнага факультэта адводзіцца картаграфічнаму чарчэнню.**

**НА ЗДЫМКУ нашага фотакарэспандэнта Д. ЧАХОВІЧА вы бачыце у час такіх заняткау студэнтау другога курса.**

⊙

ДАБАЙЦЕ АБМЯРКУЕМ

# СТУДЭНЦКІ БЫТ: ЯКІМ ЯМУ БЫЦЬ?

## ХАРЧАВАЦЦА МОЖНА ЛЕПШ

У ЛЮТЫМ на сумесным пасяджэнні мясцовага камітэта, прафкома і камітэта камсамола БДУ абмяркоувалася пытанне аб стане грамадскага харчавання у вучэбных карпусах і інтэрнатах універсітэта. На пасяджэнні адзначалася, што супрацоунікі буфетау і сталовых правялі значную работу па паляпшэнню абслугоування студэнтау, выкладчыкау і супрацоунікау. Адзначалася добрая работа буфетау на ваеннай кафедры, у інтэрнатах на Паркавай магістралі і па вуліцы Свярдлова, а таксама сталовай № 1 фабрыкі-загатовачнай.

Побач з поспехамі выяўлен і рад грубейшых парушэнняу правіл савецкага гандлю. Так, у буфетах на філалагічным, фізічным факультэтах і у сталовай галоунага корпуса мелі месца здарэнні аблічвання пакупнікоу. Паступае шмат скаргау на нізкую якасць ежы, асабліва першых страу, часта у буфетах і сталовых абмежаваны асартымент страу. Не заусёды ёсць у продажы раніцай малочныя прадукты.

Многіх прэтэнзіи можна было б пазбегнуць, калі б загадчыкі сталовых часцей выходзілі у абедзенную залу і прыслухоуваліся да водгукау і пажаданняу наведвальнікау.

Мясцовы камітэт абавязау загадчыцу сталовай № 33 тав. Трунову і загадчыка кафэ № 1 тав. Шыманскага палепшыць абслугоуванне, правесці сустрэчу са студэнтамі па пытанню лепшай арганізацыі харчавання.

З добрай ініцыятывай выступілі камітэт камсамола і рэдакцыя насценнай газеты «Алгарытм» факультэта прыкладной матэматыкі. Яны правялі апытанне студэнтау аб стане грамадскага харчавання ва універсітэце. І атрымалі шмат карысных звестак. Студэнты прыкмецілі такія сур'ёзныя упушчэнні у рабоце сталовых, якія пры праверках не былі зауважаны.

Многія студэнты просяць аднавіць работу буфета у галоуным корпусе, дзе прадавалі малочныя прадукты, напіткі і кандытарскія вырабы. У буфеце яны маглі у час перапынку хутка перакусіць. Такі буфет у сталовай галоунага корпуса у першым семестры працавау, і штодня ім карысталася каля 300 студэнтау. У цяперашні час буфет закрыт з-за цеснаты у памяшканні сталовай.

Студэнты ставяць таксама пытанне аб арганізацыі продажу у вучэбных карпусах піражкоу і кандытарскіх вырабау.

Пытанне гэтае пастаулена перад Упраўленнем грамадскага харчавання Мінгарвыканкома, якое абяцала у бліжэйшы час арганізаваць продаж піражкоу і кандытарскіх вырабау у корпусе геаграфічнага факультэта.

Многія студэнты у анкетах ставяць пытанне аб продажы абанементных талонау на комплексныя абеды. Папярэдні продаж абанементных талонау на комплексныя абеды з'яуляецца прагрэсіуна формай абслугоування. Яна дае магчымасць хутка паабедаць, а таксама больш раунамерна размеркаваць студэнту сваю стыпендыю на працягу месяца.

У сталовай № 1 фабрыкі-загатовачнай са студзеня месяца арганізаван продаж абанементных талонау на комплексныя абеды, але, на жаль, набылі іх пакуль лічаныя студэнты. У выніку у гэтай сталовай бяздзейнічае паточная лінія па адпусканні абедау па талонах. Па водгуках студэнтау, якія рэгулярна наведваюць сталовую № 1, яна з'яуляецца адной з лепшых, тут можна смачна і каларыйна паабедаць.

Дарэчы, усе сталовыя, якія абслугоуваюць студэнтау універсітэта, працуюць па III катэгорыі, і кошт абеду у іх складае не больш 55—60 капеек.

Камісія па грамадскаму харчаванню правяла апытанне студэнтау, каб выявіць, чаму яны не набываюць абанементныя талоны на абеды. Устаноўлена, што большасць студэнтау не уяуляе, як карыстацца гэтымі талонамі. А сістэма вельмі простая. **Абанементныя талоны на абеды штодзённа прадаюцца у буфеце сталовай № 1 фабрыкі-загатовачнай. Кошт абеду 39 і 48 кап. Талоны можна набыць на любую колькасць дзён і карыстацца імі можна на працягу усяго семестра.**

Для паляпшэння абслугоування студэнтау да новага навучальнага года на філалагічным факультэце будзе абсталявана сталовая на 50 пасадачных месц. У хімічным корпусе буфет будзе пераабсталяван у сталовую таксама на 50 пасадачных месц. Акрамя таго, у хімкорпусе плануецца зрабіць буфет для продажу штучных вырабау, малочных і кандытарскіх таварау. Прымаюцца тэрміновыя меры да адкрыцця буфета у новым інтэрнаце № 7 па вуліцы Кастрычніцкай. Мяркуецца пашырэнне кухні у сталовай № 33, што дасць магчымасць у два разы павялічыць прапускную здольнасць гэтай сталовай.

Мерапрыемствамі БДУ па выкананню рашэнняу XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ прадугледжана будаунiцтва на тэрыторыі універсітэта у 1972—1974 гг. сталовай на 250—300 месц.

**М. ЮЗАФОВІЧ,**
**старшыня камісіі па грамадскаму харчаванню МК БДУ.**

# ВЯСНА СТУКАЕ Ў ДЗВЕРЫ

*Напэўна, нідзе так востра не адчуваеш набліжэнне прыгажуні-вясны, як за горадам. І няхай яшчэ стылі на марозе дрэвы ў гадавальніку універсітэцкай вучэбнай гаспадаркі ў Шчамысліцы, а асляпляльнае сонца, буйнае цвіценне нарцысаў у цяпліцы, збудаванне новых парнікоў красамоўна сведчыла — гэта ўжо вясна!*

*— Нават без календара мы адчуваем набліжэнне вясны,— расказвае інжынер-лесавод Аляксандр Віктаравіч Мажэйка. — Усё больш паступае заявак на пастаўку дэкаратыўнага пасадачнага матэрыялу. Бо з нашай гаспадаркі на прасторы рэспублікі, на вуліцы, у скверы, на заводскія тэрыторыі гарадоў і сёл ідуць зялёныя сябры людзей—дрэвы і кусты. Мы вырошчваем тысячы саджанцаў. Каштан і ліпа, клён, ёлка, рабіна, туя, лістоўніца, бархат амурскі, бяроза, арэх манчжурскі і мноства кустовых парод штогод пакідаюць межы гаспадаркі і пасяляюцца не толькі ў Беларусі, але і на Украіне, у Прыбалтыцы.*

*Цяпер ужо прыйшлі заяўкі на саджанцы з Бабруйскага гарадскога савета аховы прыроды, Гродзенскага трэста зялёнай гаспадаркі, Ізюмскага лясгаса Харкаўскай вобласці і іншых месц.*

*Для гаспадаркі гэта вельмі прыбытковая галіна, а ў будучым плануецца зрабіць яе яшчэ больш рэнтабельнай. Будуць культывавацца новыя каштоўныя пароды, палепшыцца догляд за пасадкамі.*

*А пакуль вясна нясе многа клопатаў і патрабуе нястомнай працы ўсяго калектыву вучэбнай гаспадаркі.*

*А. АЛЕНІЧ.*



*НА ЗДЫМКУ: Ганна Аляксандраўна ЖУКОЎСКАЯ здымае ўраджай кветак у цяпліцы.*

*Фота Д. Чаховіча.*



# ГТО НА МАРШЫ

Савецкі фізкультурны рух перажывае важны этап свайго развіцця: у жыццё ўступіў новы комплекс «Гатоў да працы і абароны СССР». Ён з'яўляецца праграмай і нарматыўнай асновай савецкай сістэмы фізічнага выхавання, будзе садзейнічаць укараненню фізкультуры і спорту ў паўсядзённае жыццё савецкіх людзей, захаванню на доўгія гады іх моцнага здароўя і творчай актыўнасці, падрыхтоўцы насельніцтва да высокапрадукцыйнай працы і абароны Радзімы.

Сістэма работы па комплексу ГТО прызвана: прыцягваць да заняткаў фізічнай культурай і спортам людзей рознага ўзросту, садзейнічаць масаваму развіццю спорту і выхаванню спартыўных талентаў.

Новы комплекс мае 5 ступеней. Студэнты універсітэта здаюць нарматывы па IV ступені «Фізічная дасканаласць».

Задачы ступені — дасягненне высокага ўзроўню фізічнага развіцця і фізічнай падрыхтаванасці насельніцтва.

Ва універсітэце новы комплекс ГТО набірае тэмп. Дадзены першыя старты па лыжнаму спорту. У нядзелю, 12 сакавіка, памераліся сіламі ў Зялёным студэнты асноўнага і спецыяльнага факультэтаў прыкладной матэматыкі. На старт выйшаў 271 чалавек. Многія прывезлі з сабой лозунгі і транспаранты: «Выдатна ў вучобе — выдатна ў спорце», «Даеш ГТО».

Мужчыны спаборнічалі на дыстанцыі 5 км, дзяўчаты — 3 км. Лепшы час паказалі: Дацкевіч, які прайшоў дыстанцыю за 18 мін. 35 сек.; у дзяўчат — студэнтка IV курса Каровіна — 18 мін. 10 сек., Юрэвіч— 18 мін. 31 сек.

Вельмі вялікую падрыхтоўчую работу правялі дэкан ФПМ Я. А. Іваноў, дэкан спецфакультэта ПМ В. Т. Воднеў, выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту, адказны за факультэт В. С. Мурашоў сумесна з камсамольскім актывам факультэта.

Добры пачын зроблен.

С. КАМІНСКІ.

# ФІЗКУЛЬТУРА ДЛЯ ЎСІХ

Чарговае пасяджэнне членаў спартыўнага клуба універсітэта разглядала адно пытанне: «Прыняцце актыўнага ўдзелу ў выкананні ўсесаюзнага фізкультурнага комплексу нарматываў ГТО кожным студэнтам». З дакладам выступіў старшыня спартыўнага клуба С. К. Камінскі.

— У комплекса ГТО, — зазначыў ён, — даўняя і слаўная гісторыя. Сёлета мы адзначаем яго 42 год існавання. І як бы ні павышаліся нарматывы, спартыўны комплекс «Гатоў да працы і абароны СССР» быў для савецкіх фізкультурнікаў выпрабаваннем № 1 па фізічнай падрыхтоўцы.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад удзяляюць вялікую ўвагу фізічнай дасканаласці народа, пастаянна клапоцяцца аб здароўі працоўных нашай краіны. І прыняцце нарматываў усесаюзнага комплексу — яшчэ адно сведчанне гэтага клопату.

Актывісты спорту з розных факультэтаў прынялі ўдзел у спрэчках. Яны расказалі, што робіцца ў іх калектывах па выкананню нарматываў новага усесаюзнага комплексу. Трэба заўважыць, што многія студэнты універсітэта ўжо здалі першыя залікі ГТО па лыжах.

# СПРАЧАЮЦЦА ГАНДБАЛІСТЫ

**На рэдкасць напружана праходзілі спаборніцтвы зборных каманд факультэтаў па ручному мячу ў падгрупах. Ярка выражаных фаварытаў не было, як, дарэчы, не наглядалася і стойкіх аўтсайдэраў.**

**І усё ж відавочна перавага ў першай падгрупе спартсменаў фізічнага факультэта. Яны ўпэўнена лідзіруюць, не ведаючы паражэнняў. У другой падгрупе першыя — гандбалісты факультэта прыкладной матэматыкі, якія страцілі толькі адно ачко ў матчы з філфакам.**

**Фінальныя гульні, якія адбудуцца крыху пазней, і высветляць пераможцу, расставяць усе кропкі над «і».**

**М. КАЛІНА.**

# У ГОРЫ РАЗАМ З ГАРНЯКАМІ

*У маі на Каўказ у азнаямленчы турысцкі паход адправіцца група маладых рабочых салігорскага камбіната «Беларуськалій», а кіраваць гэтым паходам будуць альпіністы, студэнты БДУ, якія ўжо маюць вопыт хаджэння па Каўказу.*

*Нядаўна член камітэта камсамола універсітэта Анатоль Курловіч, старшыня універсітэцкага клуба турыстаў-альпіністаў, пабываў у Салігорску. Разам з сакратаром камітэта камсамола камбіната Іванам Мікулам яны абмеркавалі ўсе пытанні, якія датычалі будучага сумеснага паходу.*

*Трэба адзначыць, што гэта першы крок да ўстанаўлення цесных сувязей паміж камсамольскімі арганізацыямі універсітэта і салігорскага камбіната «Беларуськалій». Як паведаміў А. Курловіч, зараз у Салігорск з канцэртамі адправяцца універсітэцкія артысты — харавая капэла і вакальна-інструментальны ансамбль «Арганаўты».*

*Г. КІСЯЛЁЎ,*
*студэнт філфака.*

# ГЭТЫ НЯЛЁГКІ СПРЫНТ

Яна крыху флегматычная. Нават затоеная ў сабе, неахвочая да асаблівых размоў. Але гэта толькі на першы погляд. Пазнаёміўшыся з Таняй Нядзеевай бліжэй, упэўніваешся, што яна — натура дынамічная, да ўсяго мае цікавасць, прагна аддадзена вучобе, а яшчэ больш, напэўна, спорту. Лёгкай атлетыцы.

Пакуль што ў яе спартыўнай біяграфіі няма гучных тытулаў, не майстэрскія вынікі на стометроўцы, у скачках у даўжыню. Мінулы год для яе, бадай, быў не з лёгкіх. Але ён прынёс і сваю радасць як у вучобе— паступіла на факультэт прыкладной матэматыкі БДУ, — так і на бегавой дарожцы, у сектары для скачкоў у даўжыню — дабілася сваіх лепшых вынікаў: 12,1 сек. на 100 м і 5 м 60 см у скачках. Была ўключана ў склад зборнай каманды лёгкаатлетаў універсітэта, з'яўляецца членам зборнай юнацкай каманды Беларусі, зборнай «Буравесніка» краіны.

У Таццяны свае разлікі на гэты сезон, свой пункт гледжання на павышэнне спартыўных вынікаў, свая ацэнка сіл. І, дадам, у якойсьці ступені Раісы Рыгораўны Прыгожай — першай і заўсёды адзінай настаўніцы Таццяны, добрага чалавека і высокакваліфікаванага трэнера. У Раісы Рыгораўны дзяўчына займаецца з шостага класа. Рост майстэрства Тані адбыўся на вачах Прыгожай, пры яе удзеле, пры яе клопаце. Самым строгім і, не сумняваюся, правільным для Раісы Рыгораўны было патрабаванне выхаваць не толькі сапраўднага спартсмена, але і чалавека, паспяваючага ў вучобе. У гэтым сэнсе ў настаўніцы да сваёй вучаніцы ніколі не было паракаўняў. Таня закончыла з залатым медалем сярэднюю школу № 13 г. Мінска; тры пяцёркі і адна чацвёрка — такі вынік яе першай экзаменацыйнай сесіі ва універсітэце.

Спорт для Таццяны — тая крыніца, з якой яна чэрпае бадзёрасць, сілы, моц. Вядома, дзяўчыне бывае нялёгка, часта не хапае часу. Больш чым каму іншаму, ёй даводзіцца працаваць над сабой, строга размяркоўваць час.

У Таццяны, апрача трэніровак, вельмі часта спартыўныя старты рознага маштабу. Дарэчы, не так даўно яна выступала за каманду універсітэта на першынстве вну рэспублікі. Заняла другое месца ў спрынце на 60 м з часам 7,7 сек. У мінулым месяцы прымала старты ў еўрапейскім чэмпіянаце студэнтаў у складзе «Буравесніка». Унесла сваю пасільную долю ў поспех каманды.

Яе планы на будучае?

— У «каралеве спорту», —як заўважае Таня,—неўзабаве дабіцца часу 11,8 сек. на стометроўцы. Гэта вынік кандыдата ў майстры, а ў вучобе — на выдатна здаць летнюю сесію...

М. КАЛЯНКОВІЧ.



Заняткі па мастацкай гімнастыцы са студэнткамі І курса фізфака праводзіць майстар спорту А. І. Расолька. Фота Д. Чаховіча.

**ПЕШАХОД І ВУЛІЦА**

# ЦАНА ЛЁГКАДУМНАСЦІ

**Напэўна, залішне было б задавацца пытаннем, ці ёсць людзі, якія не даражаць сваім жыццём. Аднак такія людзі ёсць. Груба парушаючы правілы вулічнага руху, ігнаруючы ролю святафораў і указальных надпісаў, яны падвяргаюць вялікай небяспецы асабістае жыццё і жыццё акружаючых іх людзей. Сярод парушальнікаў правіл вулічнага руху многа студэнтаў, у тым ліку і студэнтаў нашага універсітэта.**

**Толькі за люты і прайшоўшыя дні сакавіка гэтага года былі аштрафаваны ў суме ад 3 да 10 рублёў 11 студэнтаў і аспірантаў БДУ. Сярод іх В. Валожын, У. Вярцінскі, Т. Налівайка, А. Ісачанка, І. Якаўлеў, М. Аўсянікаў і іншыя. Гэтыя людзі не жадаюць карыстацца пешаходнымі пераходамі, спрабуюць выйграць час, рызыкуючы жыццём. Тое, што адбылося са студэнткамі IV курса геафака Г. Жураўлёвай, І. Дзікун, прымушае яшчэ раз задумацца, да чаго можа прывесці бестурботнасць на вуліцы. У пятніцу, 10 сакавіка, жадаючы хутчэй трапіць на заняткі, дзяўчаты пераходзілі Ульянаўскую вуліцу пры забараняючым сігнале светафора і былі збіты праходзячай аўтамашынай. Зыход, на жаль, не з лепшых — цяжкі стан, бальнічны рэжым.**

**Гэта не адзіны выпадак. Толькі за некалькі дзён сакавіка з-за асабістай бескантрольнасці, няўважлівасці, у разліку на «пераскочу» загінулі трое і пакалечаны дзесяткі чалавек.**

**Задумайцеся! Ці варта так лёгкадумна адносіцца да сябе, да свайго будучага! Каму ж, як не нам, студэнтам, быць прыкладам строгага, правільнага выканання правіл культуры руху на вуліцах!**

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
АТ 02108 Тыраж 2000 экз. Зак. 291.